## Квэст «Ад пачуцця – да дзеяння»

**Мэта:** выхаванне ў вучняў асабістай адказнасці за лёс нацыянальнай спадчыны.

**Задачы:**

- пашырыць уяўленні вучняў аб нацыянальных асаблівасцях беларускага народу і іх значнасці ў жыцці чалавека;
- развіваць творчыя здольнасці і пазнавальны інтарэс дзяцей;
- выхоўваць пачуццё калектывізму.

**Правілы гульні:** падчас квэсту ўдзельнікі павінны з дапамогай падказак (фотаздымкаў) знайсці ў музеі 9 паштовак і выканаць заданні, змешчаныя ўнутры. Паштоўкі пранумараваны, таму заданні выконваюцца па парадку. Выканаўшы заданне, удзельнікі атрымліваюць пэўную літару, з усіх сабраных літар складаюць ключавую фразу.

**Ход мерапрыемства**

1. **Арганізацыйны момант**

Добры дзень, дзеці. У нашым музеі сёння вас чакае гульня-квэст.

Вы ведаеце, што такое квэст?

Квэст – гэта выдатны спосаб цікава і пазнавальна правесці час, бо вы павінны будзеце шмат чаго знайсці і шмат чаго адгадаць і выканаць.

2. **Тлумачэнне правіл гульні**
3. **Правядзенне гульні**

**Паштоўка 1**

Назавіце беларускае народнае свята па прапанаваных прадметах:



1.



2.

3. 

4. 

5. 

6. 

Адказы: свечка – Дзяды/Радаўніца, яйцо – Вялікдзень, бліны – Масленіца, зорка – Каляды, папараць-кветка – Купалле, печыва – Саракі.

**Паштоўка 2**

Пазнайце знакамітыя месцы Гродна. Назавіце іх.

| | |
|---|---|
|  |  |
|  | ТЭАТР ЛЯЛЕК |
|  |  |

| | |
|---|---|
|  |  |
|  |  |

Адказы: Драматычны тэатр, пажарная каланча, Свята-Пакроускі кафедральны сабор, Гродзенскі абласны тэатр лялек, Каложская царква, плошча Леніна, Фара Вітаўта, Фарны касцёл, парк Жылібера, скульптура жабы-падарожніцы.

**Паштоўка 3**

Суаднясіце назву горада з будынкам, які ў ім знаходзіцца:

| | |
|---|---|
| Гродна | Драматычны тэатр |
| Мінск | Нацыянальная бібліятэка |
| Брэст | Брэсцкая крэпасць |
| Мір | Мірскі замак |
| Навагрудак | Дом-музей Адама Міцкевіча |
| Ружаны | Палац Сапегаў |

Назвы гарадоу і будынкау выразаныя на асобных картках.









**Паштоўка 4**

Заспявайце дзіцячую калыханку “Доўгі дзень”.

**Паштоўка 5**

У школьным музеі знайдзіце і пакажыце наступныя прадметы беларускага побыту: збан, ручнік, дыван, стол, лава, жалейка, саламяны конь, лялька ў беларускім нацыянальным касцюме, прас.

**Паштоўка 6**

Выберыце сабе казку і перакажыце яе на беларускай мове.














**Паштоўка 7**

Разгадайце крыжаванку на тэму: “Беларуская кухня”

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | | | | | | | | | | |
| | | | | 2 | | | | | | |
| | | | | | 3 | | | | | |
| | | 4 | | | | | | | | |
| | | | | | 5 | | | | | |

1. Беларуская страва. Названа так, бо кавалачкі цеста заціраюць *(Зацірка).*
2. Другі хлеб беларусаў *(Бульба).*
3. З яго робяць квас *(Хлеб).*
4. Страва з дранай бульбы *(Дранікі).*
5. Аладкі можна начыняць тварагам, бульбай і … *(яблыкі)*

**Паштоўка9**

Расшыфруйце выказванне пра Гродна (з дапамогай лікаў зашыфравана выказванне пра Гродна. Лікі адпавядаюць парадкаваму нумару літар у беларускім алфавіце, г.зн. кожны лік – гэта пэўная літара. ДЖ, ДЗ асобнымі літарамі не лічацца!).

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 8 | 1 | 14 | 26 | 21 | 8 | 28 | 15 | 1 |
| | | | | | | | | |

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 17 | 18 | 28 | 15 | 7 | 14 | 1 | 15 | 19 | 12 | 1 | 4 | 1 |
| | | | | | | | | | | | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 12 | 18 | 1 | 31 |
| | | | |

Адказ: Жамчужына прынёманскага краю

## 4. Заключная частка

Пасля выканання заданняў удзельнікі з атрыманых літар складаюць ключавое слова – АДЗІНСТВА.